Пралетарыі, усіх краін, злучайцеся!

Работніца і Калгасьніца

БЕЛАРУСІ

№ 21
1933.

„ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЕУ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!“

(*Ленін аб маёўках*)

На міжнародным кангрэсе 1889 году было пастаноўлена дзень 1-га мая зрабіць сьвятам міжнароднай салідарнасьці рабочых і работніц усіх краін.

Першая маёўка ў нас сьвяткавалася ў 1891 годзе. У Піцеры ў ёй прымала ўдзел менш 300 рабочых. Ня было тады яшчэ ў рускіх рабочых сваёй організацыі, сваёй партыі. Рабочы рух у Расіі толькі пачынаўся.

Прайшло пяць год. У Піцеры арганізаваўся ўжо „Саюз барацьбы за вызваленьне рабочай клясы“, які пачаў кіраваць рабочым рухам, пачаў выпускаць лісткі. У Піцеры разгараўся забастовачны рух. Ленін сядзеў у гэты час у турме. У турме напісаў ён лістоўку „Рабочае сьвята 1 мая“. Надрукавана яна была ў 2 тыс. экзэмплярах і распаўсюджана на 40 фабрыках і заводах. Яна адыграла вялікую ролю, аб'яднала піцерскіх рабочых і дапамагла ім правесьці летнюю забастоўку тэкстыльшчыкаў Піцеру, у якой прымала ўжо удзел 30 тысяч рабочых.

У 1904 годзе Ленін піша лістоўку „Першага мая“. Яна вельмі прыгожа і горача напісана. „Кліч „Далоў самаўладзтва“ пранёсься па ўсёй Расіі. Усё часьцей і часьцей паўтараецца гэты кліч на вуліцах, на шматтысячных сходах рабочых“ — пісаў там Ленін.

У гэты час царскі ўрад ушчаў вайну з Японіяй. І Ленін пісаў у майскай лістоўцы 1904 году: „Злачынна пачатая самаўладзтвам вайна з Японіяй толькі паскорыць час яго пагібелі. Яна адкрые вочы самым несьвядомым рабочым на сутнасьць сучаснага дзяржаўнага ладу... Пратэставаць супроць гэтай злачыннай і разбураючай вайны павінны ўсе сьвядомыя пралетары Расіі. Яны павінны ў дзень 1-га мая—у дзень міжнароднага сьвята рабочай клясы—паказаць, што пралетарыят не прызнае нацыянальнай варожасьці, што рускія і японскія рабочыя, вымушаныя сваімі ўрадамі змагацца ў варожых радох, уяўляюць сябе членамі аднэй клясы, зьвязанымі брацкай салідарнасьцю (т. VI, стар. 337).

Рэволюцыя 1905 году ня зьнесла самаўладзтва, але дала рабочым вялізарны арганізацыйны вопыт, за гады рэакцыі пролетарят глыбока прадумаў перажытае. Ленскія падзеі 4-га красавіка (па новым стылі 17 красавіка) 1912 году паказалі, што сярод рабочых жыве традыцыя рэволюцыйнай масавай стачкі. Забастоўкі, выкліканыя гэтымі падзеямі, ахапілі 300 тыс. рабочых, майскія—каля 400 тыс., адначасова з гэтым узьнялася хваля і эканамічных стачак. Ацэньваючы майскія забастоўкі 1912 году ў артыкуле „Рэволюцыйны падём“, Ленін пісаў: „Руская рэвалюцыя ўпяршыню разьвіла ў шырокіх разьмерах гэты пралетарскі мэтад агітацыі, узварушэньня, згуртаваньня і ўцягненьня ў барацьбу мас“ (т. XV, стар. 536).



У 1912 годзе перад маем быў арыштован ЦК, але рабочыя аб'ядналіся, выпусьцілі лісткі з лёзугамі партыі: „дэмократычная рэспубліка, 8-гадзінны рабочы дзень, канфіскацыя ўсёй памешчыцкай зямлі“, з заклікам: „Далоў“ царскі урад. Няхай жыве дэмакратычная рэспубліка. Няхай жыве сацыялізм“. Усе рабочыя выступалі дружна, адзіным фронтам, з аднымі і тымі-ж лёзунгамі, рыхтуючыся да аднадушнага напору самаўладзтву.

Маёўка 1913 году прайшла з такім-жа ўздымам.

Імпэрыялістычная вайна, пачатая ў 1914 годзе, затрымала хвалю пралетарскай рэвалюцыі, якая паднімалася. Вайна ўскрыла апартунізм другога Інтэрнацыяналу, які прывёў да аслабленьня міжнароднай салідарнасьці пралетарыяту ўсіх краін. Рабочыя масы далі буржуазіі ўцягнуць сябе ў грабежніцкую злачынную вайну, лёгшую ўсім сваім цяжарам на народныя масы.

Тое, аб чым пісаў Ленін яшчэ ў 1904 годзе, што „злачынна пачатая самаўладзтвам вайна паскорыць час яго пагібелі“, — адбылося ў 1917 годзе.

1 мая 1917 году, скінуўшы самаўладзтва, народ сьвяткаваў сваю перамогу. Ленін з пачуцьцём глыбокага хваляваньня выступаў на гэтай маёўцы з трыбуны ЦК у Петраградзе.

У Кастрычніку 1917 году расійскі пралетарыят, звярачваючыся да пралетарыяту ўсіх краін з заклікам скончыць вайну, высока падняў сьцяг брацкай салідарнасьці працоўных усіх краін і высока трымае яго ўвесь час.

Перамога сусьветнага пралетарыятў яшчэ ня прышла. У Германіі шалее фашызм, ідуць яўрэйскія пагромы, чорнасоценцы, захапіўшыя ўладу ня спыняюцца ні перад чым, і кожным сваім крокам ускрываюць сваю сапраўдную сутнасьць, паказваюць, якія ілжывыя былі ўсе іх абяцаньні. Эўропа хвалюецца, паднімае ўсюды галаву старая нянавісьць да Германіі, пачынае разгарацца шавіністычны чад. На ўсходзе Японія ўсё больш шчыльна наступае на Кітай, стараецца разарваць яго на часткі, разграбіць.

Мы таксама перажывалі калісьці годы цёмнай рэакцыі, але ні мінуты не сумнявалася наша партыя ў перамозе. І зараз—мы ведаем—пралетарыят краіны, даўшай чалавецтву вялікіх змагароў і мысьліцеляў, правадыроў сусьветнага пралетарыяту—Маркса і Энгельса, ня гледзячы на ўсе намаганьні гінучай буржуазіі і яе адкідаў, зьбярэ сілы, згуртуецца ў адзіны рабочы фронт і нямінуча пераможа. У гэтым годзе, такім цяжкім для пралетарыяту ўсіх капіталістычных краін, дзень 1 мая, дзень пралетарскай салідарнасьці мае асаблівае значэньне.

На зьмену капіталізму ідзе сацыялізм. Яго перамога бясспрэчная.

У 1920 годзе ў нас, у краіне Саветаў, дзень 1 мая быў усерасійскім суботнікам—маёўкай. Гэта быў разгар грамадзянскай вайны. Ленін тады пісаў: „Трэба зжыць, трэба хутчэй кончыць з гэтым праклятым лёзунгам: „кожны за сябе, адзін бог за ўсіх". Трэба пралетарскую працоўную дысцыпліну давесьці да самай высокай ступені напружаньня і тады мы будзем непераможныя". „Толькі самыя агідныя людзі, якія беспаваротна прадаліся капіталізму, здольны асуджаць выкарыстаньне вялікага першамайскага сьвята для масавай спробы ўвядзеньня камуністычнай працы". Далоў старыя грамадзкія сувязі, старыя эканомічныя адносіны, старую свабоду падначаленай капіталу працы, старыя законы, старыя звычкі! Будзем будаваць новае грамадзтва. Нас не палохалі паражэньні ў ходзе вялікай рэвалюцыйнай барацьбы супроць царызму, супроць буржуазіі, супроць сусьветнамагутных імпэрыялістычных дзяржаў. Нас не палохаюць гіганцкія труднасьці і нямінучыя ў пачатку цяжкай справы памылкі, бо справа пераапрацоўкі ўсіх працоўных звычак і правоў—справа дзесяцігодзьдзяў. І мы даем адзін другому ўрачыстае абяцаньне, што мы гатовы на ўсякія ахвяры, што мы ўстаім і вытрымаем у гэтай самай цяжкай барацьбе, барацьбе з сілаю звычкі, што мы будзем працаваць гады і дзесяцігодзьдзі не пакладаючы рук". (т. XXV, стар. 256). Ільліч клікаў масы рабочых да практычнага будаўніцтва сацыялізму.

На шаснаццатым годзе існаваньня савецкай улады пралетарыят СССР застаецца верны лёзунгу брацкай пралетарскай салідарнасьці, чорнасоценнаму хлусьліваму рэжыму процістаўіць лёзунг Маркса—Энгельса—Леніна—Сталіна: „Няхай жыве ва ўсім сьвеце сацыялізм"! „Няхай жыве сусьветная сацыялістычная рэвалюцыя"!

(Дана ў скарочаным выглядзе)

(*„Зьвязда"*). Н. Крупская

„Сацыялізм ня толькі не пагашае сацспаборніцтва, а, наадварот, упяршыню стварае магчымасьць застасаваць яго сапраўды шырока, сапраўды ў масавым разьмеры, уцягнуць сапраўды большасьць працоўных на арэну такой работы, дзе яны могуць паказаць сябе, разгарнуць свае здольнасьці, выявіць таленты, якіх у народзе—непачатая крыніца і якіх капіталізм мяў, ціснуў, душыў тысячамі і мільёнамі..." (Ленін).

Ленінскае спаборніцтва ў дзеяньні

Кастрычніцкая рэвалюцыя стварыла зусім новыя адносіны да працы з боку пралетарыяту. Праца ва ўмовах дыктатуры пралетарыяту стала „самай пажаданай справай, якая заслугоўвае грамадзкага ўхваленьня“ (Сталін). Сацыялістычная арганізацыя працы „трымаецца і чым далей, тым больш будзе трымацца на свабоднай і сьвядомай дысцыпліне саміх працоўных, якія скінулі ярмо памешчыкаў і капіталістаў“ (Ленін).

На гэтай аснове, на аснове новых адносін да працы і выліваецца энтузіязм працоўных мас ва ўсё новыя і новыя формы сацыялістычнай арганізацыі працы, у формы сацспаборніцтва і ўдарніцтва.

Першы суботнік у 1919 годзе быў ужо пачаткам гераічных форм працы рабочай клясы на карысьць сацыялізму. Уладзімер Ільліч пісаў аб гэтым суботніку, што ён „мае бо́льшае гістарычнае значэньне, чым любая перамога Гіндэнбурга, або Фоша і ангельцаў у імпэрыялістычнай вайне 1914—1918 гадоў“.

Гэроі 1-ай пяцігодкі фабрыкі „Кастрычнік“ (Менск) т. т. Мэтар, Круцько і Меламед.

З таго часу пройдзен вялікі гістарычны шлях. Закончылі адбудоўчы пэрыяд. Пленум ЦК УсеКП(б) у 1928 годзе заклікаў усіх членаў партыі сканцэнтраваць увагу на мабілізацыі працоўных мас, на выкананьні вялікіх заданьняў у пэрыяд сацыялістычнай перабудовы народнай гаспадаркі. Перадавыя ўдарнікі Ярцаўскай тэкстыльнай фабрыкі „Катушка“ адразу-ж адказалі на гэты заклік партыі сваёй палітычнай актыўнасьцю ў правядзеньні перавыбараў саветаў, якія яны правялі шляхам шырока разгорнутага сацыялістычнага спаборніцтва. Тав. Сталін адзначыў гэты пачын рабочых, якія кінулі парасткі ленінскага спаборніцтва.

1929 год. Ва ўсім савецкім друку быў надрукован артыкул Леніна „Як арганізаваць спаборніцтва“. Роўна праз тыдзень „Комсомольская правда“ кідае выклік на спаборніцтва на зьніжэньне сабекошту. На гэта адгукнуліся камсамольцы „Красного Путиловца“, якія выклікалі на сацспаборніцтва мэталюргічныя заводы Поўначы і Уралу.

Сакавік 1929 году. Перадавыя пралетары гораду Леніна з заводу „Красный выборжец“ прыслалі адкрыты ліст да ўсіх працоўных СССР у ЦО партыі „Правду“. У гэтым лісьце рабочыя, якія „ўсьвядомілі сутнасьць сацыялізму, лепш за тых, хто кідаўся рэвалюцыйнымі фразамі“ (Ленін), заклікалі ўвесь пралетарскі калектыў Саюзу на барацьбу за павышэньне прадукцыйнасьці працы, за сацыялістычную дысцыпліну на аснове разгортваньня спаборніцтва. Гэта адозва ахапіла яшчэ большым полымем ленінскага спаборніцтва працоўных усёй краіны. Моцна пракацілася хваля індывідуальных і калектыўных выклікаў, дагавароў на ажыцьцяўленьне пастаўленых партыяй задач.

Новай сілай, узьнімаючай сацспаборніцтва на яго вышэйшую ступень, паслужыў заклік XVI партыйнай канфэрэнцыі да ўсіх рабочых і працоўных Саюзу прыняць актыўны ўдзел у сацыялістычным спаборніцтве.

Пяцігодка стварыла новыя формы сацспаборніцтва і новую якасьць сацыялістычнага вытворцы — ударнікаў. Пяцігодка запісала тысячы прыкладаў і прозьвішч гераічнай барацьбы пралетарыяту за справу сацыялізму. Сіла гэтых прыкладаў ахапляе ўсё большыя і большыя масы працоўных савецкай краіны. Ад першых камуністычных суботнікаў, праз ударныя брыгады, грамадзкія і вытворчыя агляды, сустрэчныя прамфінпляны, грамадзкі буксір, гаспадарча-разрахункавыя брыгады—такі ланцуг ленінскага сацыялістычнага спаборніцтва. Ад паасобных перадавікоў да 4-хмільённай арміі ўдарнікаў—такі размах ленінскага спаборніцтва да яе 4-ай гадавіны. За гэты пэрыяд першыя парасткі камуністычных адносін да працы выраслі ў магутную сілу шматмільённых працоўных мас.

Другая пяцігодка ставіць сваёй цэнтральнай задачай у галіне прамысловасьці асваеньне новых заводаў і новай тэхнікі, узьняцьце прадукцыйнасьці працы і зьніжэньне сабекошту. У галіне сельскай гаспадаркі задачы другой пяцігодкі— павысіць ураджайнасьць, „умацаваць калгасы арганізацыйна, вышыбіць адтуль шкодніцкія элемэнты, падабраць сапраўдныя бальшавіцкія кадры для калгасаў, зрабіць калгасы сапраўды бальшавіцкімі. У гэтым зараз галоўнае“ (Сталін).

Роля сацыялістычнага спаборніцтва тут вялізарная. Дабіцца поўнага выкарыстаньня магутнасьці прадпрыемства, аўладаць тэхнікай яго вытворчасьці, выкараніць да канца ўраўнілаўку і абязьлічку, выкрываць рвачоў і лодыраў і на аснове ўсяго гэтага ўзьнімаць сыстэматычна

і няўхільна прадукцыйнасьць працы, паляпшаць якасьць прадукцыі—вось зьмест сацыялістычнага спаборніцтва на даным этапе яго разьвіцьця.

Рабочыя і калгасныя масы Савецкай Беларусі, як і ўсяго Савецкага Саюзу, сустракаюць гадавіну сацспаборніцтва і дзень І-га мая новай хваляй арганізацыі ўдарных брыгад і ўмацаваньня ўсіх зьвеньняў і форм сацыялістычнага спаборніцтва. Не парадная шуміха, ня пустая галаслоўная дэкляpацыя патрэбна пралетарскаму сьвяту, а вынікі бальшавіцкай упартай барацьбы за выкананьне нашых плянаў.



Домны Кузьнецкбуда.

Мінулая калдагаворная кампанія ўзьняла творчую ініцыятыву пралетарскіх і калгасных мас на яшчэ большую ступень. Перагляд заніжаных норм у часе калдагаворнай кампаніі рабочая кляса сустрэла новым уздымам сваёй творчай ініцыятывы. Перадавыя пралетары Савецкай Беларусі ўжо дэманструюць ня толькі выкананьне, але і перавыкананьне новых павышаных норм. На заводзе „Бальшавік" у другім хромавым цэху норма па ручной плаціроўкі была павышана са 147 штук да 184. Рабочы Стукойр дае ў выкананьні гэтай нормы 200 адзінак, рабочы Лойка—193, Міньківіч—191. На Гомсельмашы перагледжана 526 норм, што дае эканомii 109,8 тысяч руб. З ліку гэтых норм 119 былі перагледжаны самімі рабочымі ў парадку ўласнай ініцыятывы. Большасьць гэтых норм на сёнешні дзень ня толькі выконваецца, але і перавыконваецца. Брыгада паліроўшчыц на чале з брыгадзірам Шнэйдэр (шчотачная, г. Менск) па ўласнай ініцыятыве павысіла нормы на 17 проц. па ўсіх працэсах.

Такія-ж прыклады творчага ўздыму характэрны і для многіх іншых прадпрыемстваў Савецкай Беларусі.

Ці-ж ня яркія факты глыбокага перавыхаваньня, барацьбы са старымі звычкамі, даюць выступленьні дэлегатаў на калгасных зьездах СССР і БССР.

Клімава Ганна (калгас „Прасьвет", Веткаўскі раён) расказвае зьезду, як яна выпрацавала 411 працадзён і атрымала 47 пудоў збожжа, 100 пудоў бульбы; два пуды ільну і інш. Крот Агата рапартуе зьезду калгасьнікаў Беларусі аб тым, што яна на аснове сацспаборніцтва выпрацавала 250 працадзён. Цэлы рад іншых ударнікаў сацыялістычных палёў дэманстравалі свае посьпехі ў справе калгаснага будаўніцтва, здабытыя імі на аснове ленінскага сацыялістычнага спаборніцтва.

Рабочыя і работніцы менскіх заводаў імя Варашылава і „Бальшавік" напапярэдні гадавіны сацспаборніцтва і 1-га мая кінулі кліч да ўсіх пралетараў і ўсіх працоўных Савецкай Беларусі аб выкананьні вялікіх задач пляну першага году другой пяцігодкі.

Падняць прадукцыйнасьць працы, зьнізіць сабекошт, палепшыць якасьць прадукцыі, умацоўваць пралетарскую дысцыпліну, выкрываць кляcавага ворага, берагчы машыны, абсталяваньне, сырэц, ахоўваць сацыялістычную ўласнасьць ад ворагаў народу,—вось галоўнейшыя задачы ўдарнікаў вытворчасьці.

Перадавыя пралетары гораду—гэта павадыры сацспаборніцтва ў калгасах. Перадача пралетарскага вопыту арганізацыі сацыялістычнага спаборніцтва ў калгасы і саўгасы—ёсьць бальшавіцкі шлях укараненьня сацыялістычных форм працы ў вёсцы.

Веснавая сяўба першага году другой пяцігодкі—рашаючае зьвяно ў народна-гаспадарчым пляне 1933 году. Гэта задача ня толькі калгасьнікаў і працоўных аднаасобных сялян, а ўсёй рабочай клясы і працоўных мас нашай краіны. За веснавую сяўбу адказваюць і заводы. Дапамагчы свайму падшэфнаму сельсавету правесьці па-бальшавіцку веснавую сяўбу, дапамагчы выкрыць у калгасах кляcавага ворага і ачысьціцца ад яго—баявая задача заводаў.

Перадавыя ўдарніцы, як найбольш дысцыплінаваны авангард, сілай свайго прыкладу адыгрываюць вялікую ролю ва ўмацаваньні пралетарскай жалезнай дысцыпліны, ва ўзмацненьні магутнасьці СССР—ударнай брыгады сусьветнага пралетарыяту.

Сустрэнем 4-ую гадавіну сацспаборніцтва новым папаўненьнем радоў ударнікаў. Ударнай работай забясьпечым выкананьне пляну першага году другой пяцігодкі!

Пад кіраўніцтвам бальшавіцкай партыі і яе Ленінскага ЦК—наперад да новых перамог!

Ш—ў.



Уноў пабудаваная абора на 80 кароў у камуне „Прагрэс", Лёзьнянскі раён.

З. Бандарына.

Першы Май

[Навэля]

— Лейтэнант!—голасна крыкнула Эльза, пазнаючы Вардэна.

Вочы голкамі агледзелі вопратку, аблічча. Ён не сьпяшаўся адказваць. Ля вуснаў па бакох лягліглыбокія маршчыны. Семшэсьць год прайшло з першай сустрэчы. У памяці—канец красавіка, выпускны экзамэн, дзяўчына ў белай сукенцы з букецікам фіялак.

О, гэтыя фіялкі! Паэты кідалі іх пад ногі каханкам, безьліч прыгажэйшых жанчын штогод удыхаюць у сябе іх водыр востры і крыху п'янаваты. Фіялкамі называлі ў Эльзіным шпіталі лілёвата-шызыя гангрэнозныя плямы.

— Фіялкі—мэханічна паўтарае памяць Вардэна і вочы, вароча-ючы да рэчаіснасьці, выразна бачаць сьвежы букецік фіялак, ўторкнуты ў Эльзін карсаж.

— Эльза.. — падблізіўшыся, амаль шэпатам гаворыць Вардэн.

— Мэйнэ лібэ Эльза!!. музыкай гучыць у яе памяці. Навошта?!

Але хіба хто адкажа, чаму так ярка сьвеціць майскае сонца і чырвонагруды сьнягір высьвіствае гарэзьліва вясёлую мэлёдыю..

І хіба патрэбен адказ ды аналіз з базаванымі вынікамі... Не, вясна ў кожным нараджае прагу да жыцьця.

Шпіталь.

Сымэтрычна разьбегліся чорныя літары па невялічкай шыльдзе „Хірургічнае аддзяленьне". У белым халаце, у касынцы— Эльза на наскох перасекла палату падыйшла да выключальніка. Спынілася, быццам забыўшыся пра свой намер.

Мяккае сьвятло электрыкі цытрынавай скарынкай клалася на абліччы хворых. Ля вакна стаяў пусты ложак. Учора там памёр Фрыц Гаўс, падабраны ў бараку для беспрацоўных. Гэта няўдалы замах на самагубства, рана загнаілася і вясна шчыра спрыяла гангрэнай...

Белая постаць крыху хіснулася бліжэй прытуліўшыся да сьцяны.

Шырока адчыненыя вочы пражэктарамі сьвяцілі ў пяражытае.

Учора быў па-сапраўднаму цяжкі дзень. Бадай у кожнай палаце два—тры мерцьвякі...

Уколы морфія,
камфара,
— пасьля хрыпы,
сударгі...

Праз гадзіну іх месцы былі заняты другімі. Гэта ў большасьці праца штурмавікоў і...

Бэрлін.

Фрыдрыхштрассэ. Кавярня...

Вілі дванаццаці год.

Прадавец „Ротэ Фанэ"...

Майскі вецер кідае яму ў твар сонечныя праменьні.

Ён стаіць на рагу.

У яго пад пахай пак сьвежых нумароў „Ротэ Фанэ".

У яго сьмяюцца сінія вочы.

Сёньня шчасьлівы і радасны дзень.

Вілі пойдзе на маёўку.

Там адразу расхопяць усе нумары „Ротэ Фанэ".

У яго будуць грошы на абед.

Ён ужо чуе араматычны пах бульёну і тлусты гуляш...

Буль-буль-буль, забулькала ў Віліным жываце.

— Гэр! Вы жадаеце купіць „Ротэ Фанэ"?!

Тут выключныя навіны, гэрр!!

За комуністаў галасавала 6 мільёнаў, гэрр!!.

Вілі памыліўся. Вілі не разгледзеў фашыстоўскага знаку на гарнітуры лейтэнанта Вэрджа.

Ггаах...

хх-х...

Грукнулася галава аб каменны ганак. Процьма... а пасьля здалёку ціхая калыханка...

У кавярні. На Фрыдрыхштрассэ. „Майнэ лібэ Аўгустэн"...

— Старанна цілікае скрыпка. „Майнэ лібэ Аўгустэн", — дубальтуе глухаватым голасам сусед лэйтэнанта Вэрджа...

— Гэты пашчонак да канца не хацеў разьвітацца са сваёй камуністычнай агітацыяй. Я кінуў яго галавой аб каменны ганак, а ён і тады трымаў пад пахаю свае газэты...

— Ха, ха, ха...

— Вы, запросіце мяне на вясельле?!

— Падросткам яна захаплялася адраджэньнем Нямеччыны...

— Гэта фру доктар занадта сур'ёзная, аднак...

„Майнэ лібэ Аўгустэн"...

Сымэтрычна разьбегліся чорныя літары на невялічкай шыльдзе „Хірургічнае аддзяленьне".

— Вілі. Дванаццаці год?!

Прадавец „Ротэ Фанэ"...

— Гэта ён сьмяяўся так радасна сёньня на рагу?!

— Гэта яго бацьку зьбілі да сьмерці штурмавікі, а маці засадзілі ў казэмат...

— Прафэсар! У імя справядлівасьці. Вы павінны выратаваць гэтага хлопчыка.

Сёньня—першае мая.

Эльза ледзь пазнала на апэрацыі ў дванаццацігадовым хлапчуку з праламаным чэрапам, з вялізным сіняком замест вока, свайго даўняга ўлюбенца—малога прадаўца „Ротэ Фанэ".

Другія суткі ня выходзіць Эльза са шпіталю, другія суткі не пакідае яна палаты.

Вось там на крайнім ложу...

Муфтай забінтаваная галава, павольна шавеляцца сасмаглыя вусны. Другія суткі ў яго трымаецца 40,5°...

На абходзе прафэсар Бэр, звычайна асьцярожны ды чулы, загадаў ёй ісьці да дому і безнадзейна махнуў рукой:

— Тут навука бясьсільна, маё дзіця, вы патрэбны мне для чарговай апэрацыі...

Вілі трызьніцца:

Ён стаіць на рагу... Вецер... Не, такі вецер бывае толькі ў лютым, а можа жніўні, бо ўжо горача і смажыць вусны. У яго пад пахай цэлы пак „Ротэ Фанэ", зараз адчыняецца фабрычная брама і...

Пі-і-іць!!. Адчыніўшы сасмаглыя вусны, голасна просіць Вілі.

Піць?—пытаецца Эльза, нахіліўшыся да яго са шклянкай вады.

Але хлопчык не бярэ вады. Ён трызьніць зноў, а можа не, мо' сапраўды праз мураваныя сьцены ўрываюцца галасы і мэлёдыя песьні:

„За-воды вста-вайте
в ше-ренги вступайте,
ша-гай-те,
ша-гай-те, ша-гай-те"...

Вілі прыпаднімаецца на ложку. У яго гараць сінія вочы. Праз бінт на галаве прасочваецца кроў.

І Вілі ня слухае добрую фрау доктара.

Перад ім расступіліся сьцены, ён бачыць шэрагі дэманстрантаў, ён бачыць наперадзе чырвоныя сьцягі, ён горача падхапляе словы любімай песьні

— „На бой пролетары
за дела сваё"

Тады ўсё ніжэй спускаецца столь. (Ціхі жалобны марш). Націскае на яго столь, ён выпростувае ногі і раптам пачынае дыхаць глыбока, вольна.

Яму робіцца лёгка, лёгка...

Так прыходзіць цішыня, суцэльная цішыня—першая і астатняя спадарожніца Вілі — прадаўца „Ротэ Фанэ" з Зольдэнштрассэ.

— Не, я не палітык. Навука аб'ектыўна раскрывае фактары жыцьця, арганізму. І я захоплены тымі задачамі, што стаяць на сёньня перад мэдыцынай і ў прыватнасьці перад хірургіяй. Я рэжу трусоў, пацукоў, раблю досьледы над імі і мая жорсткасьць апраўдваецца мэтай. У палітыцы—крыху інакш, прынамсі зараз у нас... Я баюся, што часам аналёгічныя дзеяньні ператвораны ў самамэту. Дзяржаўны лад у гэтым шукае выйсьце з крызісу. І мне крыху сорамна за сваю Нямеччыну перад Эўропай. Права на забойства атрымліваюць пераконаныя ворагі, але завошта адказваюць дзеці... Я не разумею гэтага. У мяне не дзяржаўны розум. Я—чалавек навукі. Вы шукаеце справядлівасьці, Эльза... І яна—толькі ў навуцы.—Паскараць?! Не, усё эвалюцыянізуецца, усё паступова рушыцца само па сабе. Мы павінны фіксаваць факты і ўдасканальваць хірургію...

Профэсар Бэр аберуч абхапіў паголеную галаву. У коміне сіняватым полымем дагарае вугольле, раскідаючы сьветавыя цені па кашлатым мядзьведзі, распластаным на падлозе.

У габінэце, проста абсталяваным, цёпла і прытульна. Прынамсі, Эльза ня хоча ведаць лепшага прытулку за гэтае глыбокае скураное крэсла.

Паўночная готыка сярэднявечча ў важкай чорнай канапе з палымнеючай языкамі інструкцыяй, у гэткіх-жа крэслах. Вялічэзная мудрасьць чалавецтва, сабраная ў шматтысячных тамох ды акуратна расстаўленая па паліцах, сьведкаю жывой і недасяжнай паглядае з-за шкла.

Дагарае вугольле.

Сіняватае полымя прожылкамі адбіваецца на абліччы прафэсара.

— Вы казалі пра права прыгнечаных... Так, Эльза, так... Я разумею. У вас добрае сэрца... Я—стары чэрствы хірург, праца зрабіла мяне жорсткім ды сухім чалавекам. Вы хочаце пратэставаць!? Але гэта—аб'ектыўнасьць! Слава?! Так, пра мяне пішуць—славуты прафэсар, праектуюць клініцы надаць маё імя. Але ці ў гэтым сэнс?!. Вы хутка здасьцё дыплёмную работу і будзеце залічаны маім асыстэнтам. Вы яшчэ дужа маладая, Эльза, вам усяго дваццаць чатыры гады. Перад вамі шырозная дзейнасьць у навуцы і я ня раю займацца палітыкай.

(*Канец у наступным нумары*).



Пралетарыі ўсіх краін! Ідзеце пад сьцягі Ленінскага Камуністычнага Інтэрнацыянала! Наперад—да новых баёў і перамог! Хай жыве сусьветная сацыялістычная рэвалюцыя! Братом па клясе, ахвярам фашысцкага тэрору, вязьням капіталу—наша пралетарскае прывітаньне!

Няхай жыве спаборніцтва і ўдарніцтва ў калгасах! Далоў лодыраў і дармаедаў!

За выкананьне сяўбы ў тэрмін!

Мучнікова Наста, Скок Ганна, Івашка Ганна, дэлегаткі-ўдарніцы калг. „Новы шлях" Быхаўскага раёну.

АБВЯСЬЦІЛІ ЗАКЛІК УДАРНІЦ

Дэлегацкае вока ў калгасах „Рэвалюцыя" і „Шлях Леніна" усюды—і на стайні, і па МТФ, і ў сьвірнах, дзе схавана насеньне.

Сабраліся дэлегаткі і пільна слухаюць аб зьезьдзе калгасьнікаў-ударнікаў. Як заўсёды, ад разважаньняў і заўваг яны хутка пераходзяць да канкрэтных спраў.

— І сапраўды,—гаворыць Мучнікова, — мы самі вінаваты ў сваіх недахопах. Галоўнае, гэта правільна арганізаваць працу. Мы павінны стаць ударніцамі. Каб па нас—дэлегатках—раўняліся іншыя.

Прапанову Мучніковай падхапілі, акружылі цесным колам стол і тут-жа выпрацавалі пункты, за якія яны, як ударніцы, будуць змагацца.

Галоўнае ў іх сац. дагаворы—якасьць працы і добрасумленныя адносіны да яе. Дэлегаткі парашылі, што мала самім стаць ударнікамі, трэба ў рады ўдарніц уцягнуць усю масу жанчын, і парашылі гэта зрабіць праз насьценную калгасную газэту. **Абвясьцілі заклік ударніц імя першай вясны другой пяцігодкі.** Вылучылі брыгаду ў складзе **Мучнік Насты, Данілушкінай, Івашка, Сычовай, Бараноўскай, Рудзік Ф.,** для праверкі сацдагавору, які быў заключан 8 сакавіка паміж калгасамі „Рэвалюцыя" і „Шлях Леніна".

Сычовай, як загадчыцы МТФ, бліжэй знаёма малочная справа і яна напомніла аб ходзе загатовак малака. Зацягваюць калгасьнікі здачу малака, а час для здачы самы падыходзячы, каровы пацялліся. І тут парашыў дапамагчы дэлегацкі сход. Вылучыў брыгаду па праверцы здачы малака ад кароў калгасьнікаў. У брыгаду высунулі калгасьніц, ужо поўнасьцю выканаўшых плян здачы малака: **Скок, Бараноўскую Вульляну** і рахункавода **Каган.**

Аднагалосна пастанавілі дэлегаткі ўзяць на буксір жанчын з калгасу імя Фрунзэ, якія прымаюць слабы ўдзел у грамадзкім жыцьці, не праяўляюць ініцыятывы па ліквідацыі недахопаў, заўважаных у працы.

Быхаўскі раён. **В.**

З ВЯЛІКІМ УЗДЫМАМ

Сур'ёзна рыхтавалася дрысенская партарганізацыя да сваёй раённай канфэрэнцыі калгасьніц-ударніц. Правялі па калгасах 127 сходаў калгасьніц сумесна з аднаасобнікамі. 2-IV адбылася радыёперакліч парт'ячэек і сельсаветаў аб ходзе падрыхтоўкі да раённай канфэрэнцыі калгасьніц. Прысутнічала больш 100 чалавек. 4-га, у дзень адкрыцьця канфэрэнцыі, была арганізавана дэманстрацыя і мітынг, прысьвечаныя першаму раённаму зьлёту калгасьніц-ударніц. Іх суправаджалі чырвоныя абозы са збожжам (9 тон), ільном (2 цэнтн.).

Дэлегаткам выдавалі мандаты, да кожнай дэлегацыі былі прымацаваны члены райкому, якія ўвесь час знаходзіліся з дэлегацыяй.

Даклад аб выніках усесаюзнага і ўсебеларускага зьездаў калгасьнікаў-ударнікаў і задачах калгасьніц у веснавой сяўбе зрабіў сакратар райкому партыі тав. Будзін.

30 чалавек выказалася ў спрэчках. Калгасьніца Пагумірская з калгасу „Пралетарскае", Каркалецкага сельсавету, расказала, што ў іхнім калгасе працуе кантрольная брыгада па праверцы ўсёй падрыхтоўчай работы да сяўбы, якая складаецца выключна з жанчын.

— Да вясны мы рыхтуемся па-ўдарнаму і думаем у гэтым годзе лепш засеяць і апрацаваць нашы калгасныя землі і атрымаць лепшы ўраджай, — заканчвае тав. Пагумірская.

У калгасе імя Варашылава ўжо ўзаралі паўтара *га*. Усё да сяўбы падрыхтавалі сваячасова: поўнасьцю ссыпана ачышчанае насеньне, нават аказана дапамога насеньнем суседняму калгасу „Камінтэрн". Коні ў калгасе падрыхтаваны. З 1-IV па ініцыятыве жанчын-калгасьніц адкрылі яслі, — паведаміла тав. Гуляй.

Дэлегатка ўсесаюзнага і ўсебеларускага зьездаў калгасьнікаў-ударнікаў тав. **Хаткевіч** падзялілася ўражаньнямі са зьездаў.

— Нам у калгасах неабходна забясьпечыць жалезную дысцыпліну, ліквідаваць абязьлічку, зьнішчыць прагулы і ачысьціць поўнасьцю калгасы ад клясавачужых і шкодніцкіх элемэнтаў. Калі мы правядзем такую ачыстку ў калгасах, то будуць ачышчаны і нашы палі ад пустазельля і сьмецьця.

Аб вострай клясавай барацьбе ў калгасе і неабходнасьці ачысткі ад кулацкіх і шкодных элемэнтаў гаварылі і калгасьніцы Хмяльніцкая (калгас „Авангард"), Пагумірская (калгас „Пралетарскае"), Быкава (калгас „Усходняя зара"), Ловіна (калгас „Чырвоны прымежнік"), Гардзей (калгас імя Карла Маркса) і інш.

Аднаасобніца Валенцік з вёскі Гілярава, Луначарскага сельсавету, заявіла, што падае заяву аб прыняцьці ў калгас, бо добра ўсьвядоміла сабе перавагі калектыўнай гаспадаркі перад дробнай сялянскай.

— У калгасе я буду працаваць добрасумленна і не адстану ад перадавых калгасьніц. Усё патрэбнае насеньне, інвэнтар, каня вдамо ў калгас. Усе загатоўкі і плацяжы, якія прыпадалі на маю гаспадарку, я выконвала ў тэрмін. Члену сельсавету ня прыходзілася хадзіць да мяне некалькі разоў.

Думку найбольш сьвядомых калгасьніц-ударніц выказала Лайкоўская, з калгасу „Прымежны маяк".

— Вярнуўшыся са зьлёту, мы павінны павесьці адпаведную работу сярод нашых жанчын-калгасьніц, каб сёлета не паўтараліся такія зьявішчы, якія былі ў мінулым годзе, калі жанчыны імкнуліся ў першую чаргу зрабіць свае прыватныя справы, як бы лепш дагледзець свой уласны гарод, а на калгасную работу выходзілі ўжо тады, калі час знойдзецца. Гэта нікуды ня варта. Я далучаюся да прапаноў аб тым, каб дапамагчы нашай жанчыне-калгасьніцы ў галіне арганізацыі дзіцячых яслей і пляцовак, бо так шмат часу адбіраюць дзеці, якіх няма на каго пакінуць".

Канфэрэнцыя паказала вялікую актыўнасьць і сьвядомасьць калгасьніц, якія, атрымаўшы тут зарадку, пасьля двух дзён працы яшчэ больш ударна возьмуцца за выкананьне ўсіх баявых задач веснавой сяўбы першага году другой пяцігодкі. **М—я.**

Дрысенскі раён.

„Трымаць гэту сілу пад спудам, значыць дапускаць злачынства" *(Сталін).*

„Вылучыць ня менш 400 старшынь сельсаветаў, 10 старшынь РВК і 500—700 старшынь калгасаў, узмацніць вылучэньне жанчын брыгадзірамі"
(з пастановы ЦК КП(б)Б, верасень 1932 г.).

Партыя і ўрад ня раз падкрэсьлівалі неабходнасьць вылучэньня лепшых ударніц—сялянак, праявіўшых сябе на працы, на кіруючыя работы. Гэта мераприемства набывае асаблівае значэньне ва ўмовах БССР — рэспублікі, у якой сельская гаспадарка мае ў асноўным ільняна-бульбяны і жывёлагадоўчы ўхіл. Якраз гэтыя галіны сельскай гаспадаркі ў сваёй большасьці патрабуюць жаночых рабочых рук.

Паглядзім-жа, як дырэктывы партыі і ўраду выконваюцца на мясцох. Паводле вестак, з 27 раёнаў Беларусі ў 19 раёнах (Лагойск, Чачэрск, Тураў, Плешчаніцы, Гомель, Пухавічы, Бягомля, Талачын, Старыя-Дарогі, Брагін, Рагачоў, Мазыр, Парычы, Любань, Дзяржынск, Расоны, Вузда, Касьцюковічы, Старобін, Клімавічы) няма ніводнага старшыні калгасу—жанчыны. Няўжо ў гэтых раёнах няма праверaных на працы ўдарніц, якіх можна вылучыць старшынямі калгасаў? Вядома ёсьць. Але раённыя кіруючыя арганізацыі не заняліся гэтым пытаньнем, не забясьпечылі выкананьня дырэктыў партыі і ўраду ў галіне вылучэньня.

Побач з гэтымі адстаючымі раёнамі трэба адзначыць Хойніцкі раён, які мае 5 старшынь калгасаў жанчын-вылучэнак, і 7 раёнаў (Капыль, Горкі, Нароўля, Уваравічы, Ветка, Лельчыцы і Віцебск) маюць па 1 старшыні калгасу—жанчыне.

Вельмі цікавыя вынікі атрымліваюцца пры аналізе лічбаў вылучэнак па вестках з 27 раёнаў. Калі зазірнуць у графу брыгадзіраў, то відаць, што жанчыны ў асноўным скарыстоўваюцца брыгадзірамі жывёлагадоўчых брыгад—у якасьці загадчыц МТФ і СТФ, і вельмі ў нязначнай меры брыгадзірамі паляводчых брыгад. З 27 раёнаў мы маем толькі 71 брыгадзіра палявых брыгад, а загадчыц фэрм—103.

Гэта гаворыць аб невыстарчальнай яшчэ ўвазе з боку раённых арганізацый і саміх калгасаў да вылучэньня жанчын на кіруючую работу ў асноўнай галіне гаспадаркі—паляводстве.

Дзяржынскі раён мае 18 жанчын-брыгадзіраў паляводчых брыгад: Любанскі—14, Нараўлянскі—11, Горацкі—10, Вузьдзенскі—7, Бягомльскі—3, Парыцкі—3, Рагачоўскі—2, Расонскі—2 і Веткаўскі—1.

Астатнія 17 раёнаў ня маюць у сваіх калгасах ні аднаго брыгадзіра жанчыны.

Ганебны прарыў у справе вылучэньня жанчын мае Тураўскі раён. Ні старшыні калгасу, ні брыгадзіра, ні трактарысткі жанчыны ў Тураўскім раёне вы ня знойдзеце. Таксама адстаюць Лельчыцы, якія налічваюць у радох вылучэнак толькі 1 старшыню калгасу, на іншых кіруючых калгасных работах жанчын няма.

Лічбы па 27 раёнах сьведчаць, што справе вылучэньня працоўных сялянак з боку кіруючых раённых арганізацый не аддаецца належнай увагі.

Неабходна, каб РК і РВК, згодна апошняй пастановы ЦК КП(б)Б, правялі праверку ўцягненьня калгасьніц у пастаянныя паляводчыя брыгады, забясьпечылі вылучэньне лепшых ударніц брыгадзірамі паляводчых брыгад. **Вольга К.**

Ударнікам і ўдарніцам—перадавым барацьбітом прывітаньне. Вышэй сьцяг

ШЧОТАЧНІЦЫ РАЗГАРНУЛІ САЦСПАБОРНІЦТВА

Аб вытворчым конкурсе, які праводзіцца на шчотачнай фабрыцы імя Крупскай (Менск), ведае кожная работніца. Дый як аб ім ня ведаць, калі ўмовы конкурсу абгаворваліся на цэхавых сходах, на сходах брыгад і на нарадах актыву ў кожным цэху. Пункты ясныя і зразумелыя выстаўлены ў конкурсе. Галоўнае—якасьць прадукцыі і працдысцыпліна, акрамя таго таксама і ўдзел у грамадзкай працы. За выкананьне паказальнікаў конкурсу зараз змагаецца кожны цэх, кожная брыгада і кожная работніца ў паасобку.

Фрыдлянд Х. лепшая ўдарніца наборнага цэху.

Узяць для прыкладу наборны цэх. Ён на фабрыцы самы вялікі. Налічвае ў сваім складзе 13 гаспадарча-разрахунковых брыгад і 3 ударныя брыгады, якія арганізаваны ўжо ў часе ходу конкурсу.

Усе брыгады ўключыліся ў конкурс. Наборны цэх заключыў сацумову з сьвідровачным цэхам і прад'явіў ім сацыялістычны рахунак на сваячасовую дачу добраякаснай прадукцыі. Гэты пункт вельмі важны для наборнага цэху, бо ў сваёй працы ён залежыць ад якасьці працы валасяного і сьвідровачнага цэхаў. Калі валасяны цэх дае дрэнна адсартаваны і перабраны волас ці несваячасова яго дае, калі сьвідровачны цэх дае сырыя і дрэнна апрацаваныя калодкі, то і наборны цэх ня можа даць добрай якасьці.

Не абыходзіцца ў наборным цэху ні адна нарада, ні адзін сход, дзе-б не закранулі пытаньня аб дошках, і таму сацыялістычны рахувак ад усіх работніц наборнага цэху быў прад'яўлен сьвідровачнаму аднагалосна.

Сам наборны цэх перабудаваў сваю работу за час ходу конкурсу. Вытворчы сэктар, на чале якога стаіць лепшая ўдарніца—работніца Маршак, улічыў, што для выпраўленьня недахопаў патрэбен дасканалы ўлік працы кожнай работніцы, патрэбна грамадзкае ўзьдзеяньне, патрэбен поўны ахоп усіх работніц сацспаборніцтвам і ўдарніцтвам. Як-жа змагаецца за гэта вытворчы сэктар?

т. Стронгіна лепшая ўдарніца наборнага цэху, плян выконвае на 115 проц.

На сьцяне цэху, на відным месцы красуюцца вялікія шчыты з фанэры. На першым фарбамі прыгожа намалёван самалёт, на другім—аўтамабіль, на трэцім—конь, запрэжаны ў калёсы, і на апошнім—чарапаха. Кожны дзень на гэтых шчытох вывешваюцца брыгады згодна выкананага імі пляну. Перадавыя—на шчыце самалёта і адстаючыя—на шчыце чарапахі. Вельмі ганебным лічыцца сесьці на шчыт чарапахі.

23-IV на шчыце чарапахі нічога ияма, на шчыце, дзе калёсы, сіратліва калышацца дошчачка з надпісам: „Брыгада т. Трушко. На шчыце самалёта красуецца брыгада тав. Адліванкінай, якая выканала плян на 128,5 проц., брыгада Грачанік—на 126,6 проц., брыгада Фітэрштэйн—126 проц., брыгада Юспы—124. Гэтыя перадавыя брыгады ніколі не сыходзяць са шчыта самалёта, яны толькі часамі мяняюцца месцамі.

Гэта гаспадарча-разрахунковыя брыгады, якія ўжо існуюць па два гады. Яны моцна згуртаваны вытворчай дысцыплінай, добра зразумелі перавагі гаспадарча-разрахунковых брыгад. Усім калектывам брыгады яны змагаюцца з непаладкамі, якія бываюць у брыгадзе.

Сыстэматычна, кожны дзень праводзяць пяціхвілінныя нарады, на якіх вырашаюць усе балючыя бакі сваёй працы, высоўваюць сустрэчныя дзенныя прамфінпляны. Па кнізе, дзе запісаны пратаколы ўсіх пяціхвілінных брыгадных нарад, можна прасачыць, як брыгады змагаюцца за якасьць прадукцыі і за працдысцыпліну.

У цэху ўведзен чорны стол, за якім працуюць парушыўшыя працдысцыпліну. І толькі тады трапіўшая на чорны стол работніца варочаецца ў брыгаду, калі яна сама ўсьведамляе свой учынак і падасьць аб гэтым заяву ў брыгаду.

т. Адліванкіна лепшая ўдарніца наборнага цэху, брыгадзір гасп.-разрахунковай брыгады.

вялікай арміі будаўнікоў сацыялізму—бальшавіцкае сацспаборніцтва і ўдарніцтва

Усе брыгады наборнага цэху ахоплены спаборніцтвам. Конкурс і спаборніцтва ўжо маюць свае вынікі. Значна павысілася працдысцыпліна і якасьць працы. Са справаздачы брыгадзіра Юспы на нарадзе вытворчага сэктару разам з актывам цэху відаць, што гэта моладзьная брыгада ня ведае зусім прагулаў і браку.

За час конкурсу (за апошнія тры месяцы) у цэху мелі месца толькі два спазьненьні на 5 хвілін. З брыгады Сянькевіч спазьнілася работніца Гяршоўская і з брыгады Жалевіч—Тэпэльман. На сваіх пяціхвілінных нарадах брыгады абгаварылі гэта пытаньне і работніцы Гяршоўская і Тэпэльман былі занесены на чорную дошку.

Работніцы вельмі зацікаўлены ў эканоміі матар'ялу—гэта адзін з пунктаў конкурсу і сацумоў.

Чым большая эканомія ў брыгадзе, тым большую долю з гэтай эканоміі атрымае кожная работніца брыгады. Так брыгада Грачанік за сакавік месяц атрымала эканоміі 151 руб. 85 кап. дзякуючы беражлівым адносінам да матар'ялу.

У брыгадзе Юспы эканоміі за сакавік ёсьць 141 руб. Брыгадзірша з гэтых грошай атрымала 10 руб. 65 кап., Калесьнікава—7 руб. 13 кап., Хурс—6 р. 24 к. і ўсе іншыя работніцы—згодна тэй эканоміі, якую яны далі.

У брыгадзе паліроўшчыц Шнэйдэр (аддзелачны цэх) добра наладжана сацспаборніцтва ўнутры самой брыгады. На пяціхвілінных нарадах кожная работніца высоўвае свае сустрэчныя пляны і выклікаюць адна другую на спаборніцтва. Лічбы сустрэчных плянаў зараз-жа вывешваюцца на сьцяне. У брыгадзе Шнэйдэр, якая складаецца з 8 чалавек, ёсьць дзьве работніцы—героі пяцігодкі—тав. Барысевіч і тав. Пракурат. Брыгада за час ходу конкурсу зьнізіла брак. Калі раней на 5 тысяч шчотак прыходзілася браку 15 шчотак, то зараз—5—6.

Разгорнутае сацспаборніцтва і ўдарніцтва на шчотачнай фабрыцы імя Крупскай служыць зарукай таго, што прамфінплян будзе поўнасьцю выканан і перавыканан.

К—ва.

Рабочыя і работніцы. Авалодвайце тэхнікай вытворчасьці, змагайцеся за высокую якасьць прадукцыі, за зьніжэньне сабекошту, за падняцьце прадукцыйнасьці. Ударнай работай забясьпечым выкананьне плянаў першага году другой пяцігодкі.

т. Лычко лепшая ўдарніца. Высунула сустрэчную норму 22, замест 18 шт. Норму выконвае на 115—135 проц.

Лепшая ўдарная брыгада паліроўшчыц на чале з брыгадзірам т. Шнэйдэр.

Фрыдлянд Л. лепшая ўдарніца наборнага цэху.

ПЕРШАЕ МАЯ У ВАРШАЎСКАЙ ТУРМЕ

(*Успаміны палітэмігранткі*)

Рэвалюцыйны рух у фашысцкай Польшчы ўсё больш узмацняецца. Рэвалюцыйная хваля ахоплівае ўсё шырэйшыя колы рабочых і сялян. Фашысцкі ўрад гэта адчувае і таму імкнецца ўсякімі сродкамі задушыць рэвалюцыйны рух, адцягнуць рабочую клясу ад рэвалюцыйнай барацьбы.

Адным з такіх сродкаў зьяўляецца фашысцкая турма. Фашысцкія каты кідаюць у казэматы кожнага рабочага, які адважыўся пратэставаць супроць капіталістычнага ладу, адважыўся змагацца за лепшае жыцьцё. Палітзьняволеныя і ў турме праводзяць далей рэвалюцыйную барацьбу. Кожная кампанія, якая праводзіцца пралетарыятам на волі, праводзіцца і палітзьняволенымі.

1932 г. За два тыдні да першага мая пачалася падрыхтоўка да гэтай кампаніі ў варшаўскай жаночай турме „Павіяк".

У турме тры аддзяленьні. Усе палітзьняволеныя кожнага аддзяленьня хадзілі разам на прагулцы. Гэта яшчэ было апошнім „правам", якое турэмная адміністрацыя ад нас не адбірала (і гэта дзякуючы тэхнічным прычынам, бо ў іх быў занадта малы пэрсанал, каб кожная з 80 палітзьняволеных жанчын спацыравала асобна). Для нас-жа гэта было адным з галоўных сродкаў сувязі з кожнай таварышкай, каб праводзіць усе кампаніі салідарна.

У нас у турме была моцная арганізацыя, якая, ня гледзячы на ўсе абмежаваньні і штрафы з боку турэмнай адміністрацыі, усё-ж такі працавала і жвава рэагавала на ўсе падзеі.

Галоўны камітэт палітзьняволеных разаслаў „Грыбсы" (паперкі) з прапановамі, як правесьці першамайскую кампанію. Камітэты аддзяленьняў правялі ў часе прагулак „пасяджэньні" з усімі арыштаванымі. З энтузіязмам была прынята пастанова галоўнага камітэту аб абвяшчэньні ў дзень першага мая аднадзеннай галадоўкі. На прагулку мы выйдзем з чырвонымі банцікамі на грудзях, арганізуем дэманстрацыю і мітынг. Была яшчэ адна задача—дастаць з волі чырвоныя істужкі, гэта павінны былі выканаць камітэты аддзяленьняў, якія мелі сувязь з шэфскімі арганізацыямі на волі. Настрой у нас быў бадзёры.

Напярэдадні 1-га мая ледзь дачакалася я прагулкі, каб канчаткова дагаварыцца як нам выступіць. Мы пастанавілі:—кампанія пачынаецца ў 6 гадзін раніцой. Аддзяленьне, дзе знаходзіцца галоўны камітэт, дае сыгнал—пачынаецца сьпеў „Інтэрнацыяналу", астатнія аддзяленьні падхопліваюць. Стоячы ля вокнаў мы да канца павінны прасьпяваць „Інтэрнацыянал". Такім чынам мы даем знак таварышом суседняй мужчынскай турмы, таварышом з волі і турэмнай адміністрацыі, што наша кампанія пратэсту, наша барацьба пачалася.

Прагулка хутка скончылася. Ужо зноў гоняць ў душныя, цёмныя камеры. Ноч. У маёй камеры ўсё падрыхтавана да заўтрашняга дня. Ежа, якую мне перадалі, падрыхтавана, каб заўтра раніцой выкінуць яе за дзьверы. У руцэ я трымала чырвоны банцік. Раптам адчыняюцца дзьверы і чалавек дзесяць турэмнай адміністрацыі, старэйшага і малодшага складу ўсіх рангаў, кідаюцца ў камеру. Гэта мабыць рэвізія—думаю я. Яны патрабуюць, каб я сказала, дзе схавала чырвоныя банцікі, каб я лепш зараз жа аддала іх, а то зробяць у маёй камеры рэвізію. Я кідаю банцік у рот так лоўка, каб яны не заўважылі. Потым тлумачу, што чырвоны банцік—гэта наш сьцяг, гэта знак нашай барацьбы і, як усе барацьбіты, я ніколі дабром нашага сьцягу не аддам.

Пачалася адна з самых лютых рэвізій. Гвалтам рвалі з мяне сукенку, паролі швы паліта, парвалі сяньнік, падушку, вылілі ваду, шукалі ў кнігах, у вушах і валасох. Пры гэтым не шкадавалі ўдараў. Рэвізія цягнулася каля трох гадзін, але нічога ня выкрылі. Чырвоны банцік—знак нашага чырвонага сьцягу—застаўся ў мяне.

І заўтра я разам з маімі таварышкамі пакажу фашысцкім катам, што мы не баімся ўдараў і зьдзекаў, наш сьцяг даражэй нам за ўсё.

Раніца першага мая. Чакаю сыгналу. Чакаю з напружаньнем, можа праслухала. Нешта так доўга цягнецца. І тут, як на зло, зазванілі ў касьцёлах. З усіх куткоў гораду даходзяць гэтыя звоны, як быццам яны дагаварыліся заглушыць наш сыгнал. Не! Нашага выкліку не заглушаць ніякія звоны! З усіх вакон вызіраюць бледныя твары, пачынаюць сьпяваць галасьней, каб сьпеў гучэў мацней, каб ён чуўся далека за мурамі турмы. Усе хочуць, каб сьпеў даходзіў да нашых братоў на волі. Але фашысцкія турэмныя вартаўнікі не маўчаць. Яны не дапускаюць выконваць наша мерапрыемства. Пажарны рукаў, які служыць для гашэньня пажараў, падрыхтован на турэмным двары. У гэты момант вартаўнікі ўжываюць пажарныя рукавы не для тушэньня пажару, а для таго, каб прымусіць нас прарваць рэвалюцыйны сьпеў.

Мы ўжо цалкам прамоклі. Халодная вада марозіць цела, але мы ня хочам перарываць сьпеву. Мы ня хочам сарваць мерапрыемства, пакуль мы яшчэ ў сілах. З калідору чуцен шум, чуваць, як адчыняюцца дзьверы і ў маю камеру зноў урываюцца паліцэйскія агенты і фашысцкія псы з жалезнымі рукавіцамі. Пачынаюцца звычайныя пабоі, да якіх мы ўжо прывыклі. Ад іх застаюцца вечныя знакі на целе. Старыя шрамы не пасьпяваюць загаіцца, як зьяўляюцца новыя. Ня гледзячы на пабоі, я перад катамі гавару аб значэньні сёнешняй кампаніі. Я выношу наш пратэст супроць пабояў, супроць хуліганскіх паводзін з палітзьняволенымі.

Надышоў час прагулкі. Але сёньня нас не выпускаюць. Праз гадзіну зьяўляецца наглядальніца, якая тлумачыць, што ў пакараньне за нашы паводзіны, за нашы крыкі, сьпевы, мы сёньня прагулкі мець ня будзем.

Здалёк пачуліся гукі „Інтэрнацыяналу". Гэта былі галасы нашых таварышоў, якія дэманстравалі на волі перад брамамі турмы. Заклік з волі даў нам разумець, што мы не адзінокі. Нашы браты на волі нас не забылі. У дзень 1 мая яны прышлі да сьцен турмы, каб аб'яднацца ў барацьбе супроць фашызму. М.

Актывісткі абароны

(Гутарка з жанчынамі—членамі 2пленуму ЦС Асавіяхіму ССР)

Тав. Селязьнёва.

Жанчыны—удзельніцы 2 пленуму ЦС Асоавіяхіму пацзяліліся вопытам сваёй работы.

Аб працы старшыні Крычаўскага райсавету Асоавіяхіму Селязьнёвай гаварылі дакладчыкі, ставячы ў прыклад другім раёнам масавую работу гэтага райсавету па абароне краіны.

Адзначалі і недахопы ў рабоце—слабая падрыхтоўка дапрызыўнікаў.

За паўгода працы Селязьнёвай у райсавеце выросла колькасць членаў Асоавіяхіму Крычаўскага раёну з 2.000 чалавек да 5 502, колькасьць ячэек павялічылася з 23 да 96.

Крычаўскі раён першы выклікаў Клімавіцкі раён на сацспаборніцтва па аглядзе нізавой работы. Разгарнулі сацспаборніцтва і паміж асобнымі ячэйкамі ўнутры раёну. Дзьве аб'яднаныя брыгады з абодвух раёнаў падводзілі вынікі.

Першым па аргмасавай рабоце (рост ячэек, умацаваньне фінансавай базы, удзел у гаспадарча-палітычных кампаніях, асабліва загатоўках) вышаў Крычаўскі раён, а па падрыхтоўцы дапрызыўнікаў вышаў першым Клічаўскі раён.

2.700 членаў Асоавіяхіму Крычаўскага раёну ахоплены добраахвотным відам вайсковай вучобы.

Ёсьць шмат жанчын — работніц і калгасьніц, якія прымаюць удзел у стралковых гурткох; яны складаюць проц. 20 да ўсіх, якія навучаюцца. Вось прозьвішчы жанчын, якія ў часе раённага стралковага конкурсу вытрымалі іспыты на першакляснага ціравога стралка: Панькоўская Варвара (47 год) з калгасу „Праца", Кашанскага сельсавету. Займаецца ў стралковым гуртку. На адлегласьці 25 мэтраў з 50 ці магчымых ачкоў дала 49. Прэміявана шалем.

Філіпенка—брыгадзір асоавіяхімаўскай брыгады сьвінарак саўгасу „Крычаў". З 50 магчымых ачкоў дала 50. Прэміявана бацінкамі.

Федарэнка—рахункавод саўгасу „Крычава"—дала з 50 магчымых 48 ачкоў.

Актыўна працуе па АСО старшыня ячэйкі Асоаяіяхіму друкарні—Гурэвіч Люба. Ячэйкай ахоплены ўсе работніцы і рабочыя. Рэгулярна займаюцца гурткі хэмняпісьменнасьці і стралковы. Усе члены АСО разьбіты на асоавіяхімаўскія брыгады, якія заключылі з брыгадамі клімавіцкай друкарні сацдагавор. У часе загатовак асоавіяхімаўскія брыгады працавалі цэлыя дні па выпуску нізавых газэт і бюлетэняў і нават начавалі ў друкарні.

За добрую работу ячэйка друкарні прэміявана дробнакалібэрнай вінтоўкай і абсталяваньнем вайсковага кутка.

Член ЦС Асоавіяхіму Катлоўская — работніца Барысаўскай друкарні, з 1932 году працуе старшынёй ячэйкі АСО. За час яе работы ячэйка выросла з 20 чалавек да 80 і ахапляе зараз усіх рабочых і работніц друкарні. Запазычанасьць у ячэйцы ліквідавана. Пры ячэйцы працуе стралковы гурток, у якім работніцы вельмі добра пасьпяваюць. На адлегласьці 25 крокаў Катлоўская з 50 ці магчымых выбівае 50, Марцінкевіч і Кулакова (работніцы) таксама далі 49—50 ачкоў.

Арганізаваны гурток хуткай дапамогі ахапляе 25 жанчын. Доктар рэгулярна праводзіць заняткі з гуртком.

Ячэйка арганізавала масавы выхад у падшэфны сельсавет, дзе была выпушчана насьценгазэта, праведзена масавая стральба, арганізавана ячэйка Асоавіяхіму. Тав. Катлоўская за добра разгорнутую масавую работу па Асоавіяхіму прэміявана месцам на курорт.

Гутарка рэдактара часопісі „Работніца і Калгасьніца Беларусі" т. Шапіра з членамі II пленуму ЦС АСО БССР. На здымку зьлева направа—жанорг ЦС т. Тур, работніца саўгасу т. Рагавер, сакратар ячэйкі АСО Віцебскай акулярнай фабрыкі т. Горава, рэдактар часопісі т. Шапіра і старшыня Крычаўскага райсавету АСО т. Селязьнёва.

Найлепшыя посьпехі ў стральбе мае тав. Горава — работніца Віцебскай акулярнай фабрыкі, член прэзыдыуму Віцебскага савету АСО. У 1930 годзе яна скончыла 3-х месячныя курсы стралковага спорту пры Віцебскім гарсавеце АСО.

2 мая 1931 году на гарадзкім стралковым спаборніцтве, у якім прымалі ўдзел мужчынскія і жаночыя каманды, Горава атрымала першае месца па жаночай камандзе і другое месца па агульнай. Стральба адбывалася на адлегласьці 50 і 100 мэтраў. Т. Горава з 150 магчымых ачкоў выбіла 119. Тав. Горава атрымала прыз—дробнакалібэрную вінтоўку з прыборам і 100 шт. патронаў.

У 1932 годзе Горава працавала інструктарам ячэйкі Асоавіяхіму акулярнай фабрыкі і кіраўніком жаночага стралковага гуртка. Зараз працуе пры цэнтральнай асоавіахімаўскай стралковай школе, якая знаходзіцца ў горадзе Віцебску.

Расьце жаночы актыў, які штодзенна прымае ўдзел у працы па ўзмацненьні абароназдольнасьці краіны, які арганізуе вакол сябе шырокія масы працоўных.

Лепшыя дэлегаткі, ударніцы-работніцы і калгасьніцы павінны павялічыць рады актывістак абароны.

М—я.

Менск.

ЯК ВЫРАСЬЦІЦЬ РАНЬНІЯ ГУРКІ

Пасьля выбаркі рассады памідораў і раньняй капусты ўсе парнікі амаль што цалкам займаюць гуркамі.

Рассаду гуркоў трэба да гэтага часу вырасьціць у асобным парніку з такім разьлікам, каб адна рама забясьпечыла рассадай 20—30 рам гуркоў.

Высадку гурочнай рассады трэба рабіць у апошніх лічбах красавіка ці ў першых лічбах мая.

З гатункаў трэба адзначыць: „Муромскі"—гуркі маленькія, іх трэба садзіць 10 пар пад рамай, „Вязьнікоўскія"—6 пар, „Нярэсімы"—6 пар.



Агульны выгляд парнікоў прыгараднай гаспадаркі „Новы сьвет" (Менск).

Мурамскія—менш разрастаюцца, два апошнія гатункі даюць вялікія плеці.

Пасадку трэба рабіць сярод рамы, каб плянкі рамы не засланялі расьліны.

З боку трэба пасадзіць пад кожную раму яшчэ па 2 рассады „старожкі". Яны патрэбны для замены дрэнна прыжываючай рассады.

Перасадку рассады трэба рабіць з камячком зямлі, тады гуркі хутка прыжываюць. Добра растуць гуркі, калі ў парніках тэмпэратура трымаецца ад 17 да 20° Ц.

Паліваць рассаду трэба ўвесь час цёплай вадой (тэмпэратура 10°), каб не прастудзіць расьліны.

Ад халоднай вады гуркі хварэюць і гінуць. У летні час трэба даць па 12—15 літраў вады на раму.

Праз 3 дэкады—месяц рассада разрастаецца так, што займае ўсю раму. Каб месца ня гуляла гэты месяц, адначасова з пасадкай рассады гуркоў, з паўночнага і паўднёвага боку высаджваюць рассаду салаты. Праз 25—30 дзён салату прадаюць, гуркі займаюць яе месца пад рамай.

Зямлю пад гуркі прыгатуйце з дзьвёх частак—дзярновай і аднэй перагнойнай, або добрую гароднюю лёгкую зямлю.

На сярэдзіне парніка да насыпкі зямлі зрабеце ў гнаі канаўку 15—20 *см* глыбіні, праз усю даўжыню парніка.

Насыпце зямлі, каб таўшчыня была па сярэдзіне—20 *см*, а па бакох—10 *см*.

Каб хутчэй атрымаць гуркі, трэба верхавіны плецяй адарваць, тады з пазухі лісьцяў вырастуць падплёткі з жаночымі кветкамі, а не з пустацьветам. Пустацьвет адрозьніваецца тым, што на ім унізе кветкі няма маленькага гурка, а на жаночым—ёсьць. Пустацьвет патрэбен для перакрыжаваньня жаночых кветак, не ў вялікай колькасьці пад рамай.

У часе крыжаваньня рамы трэба трымаць адкрытымі як мага больш часу, каб пчолы змаглі апылкаваць кветкі.

У першыя дні ўраджай гуркоў бывае слабы, потым колькасьць гуркоў павялічваецца.

Выбарку гуркоў трэба рабіць праз дзень. Сачэце, каб гуркі не пажоўклі. Першы збор гуркоў пачынаецца праз месяц пасьля высадкі ў парнік і працягваецца 50—70 дзён. Сярэдні ўраджай мурамскіх гуркоў з рамы 100—120 штук, вагой па 50—60 грам, вяркоўскіх і няросімых 60—80 штук, вагой па 80—100 грам.

У жніўні гуркі з гародаў пачынаюць зьяўляцца ў большай колькасьці—заканчваюць збор раньніх гуркоў з парнікоў.

Ад канца чэрвеня да пачатку ліпеня трэба парнікі закрываць нанач рамамі і матамі, каб не папсаваць гуркоў начнымі прымаразкамі.

Люхтаваць парнікі трэба вельмі асьцярожна. У халоднае надвор'е—мала, у цёплае—больш, але каб тэмпэратура была ніжэй 18—20° Ц.

У сухім парніку зьяўляецца „чырвоны павучок"—самы вялікі шкоднік гуркоў. Яго можна пазнаць: лісьці жоўкнуць на ніжняй старонцы ліста, праз павуціньне на сонцы можна ўбачыць многа маленькіх павучкоў. Яны высмоктваюць сок з лісьцяў гуркоў і яны засыхаюць.

Трэба пільна сачыць, каб ад хворых расьлін маты, рамы, зямля, лісьці не папалі ў здаровыя парнікі, інакш усе парнікі будуць у кароткі тэрмін пашкоджаны гэтым павучком.

Матыкамі і рукамі таксама можна пераносіць шкоднікаў.

Трэба хворыя расьліны вырваць і спаліць, парнікі паліваць халоднай вадой і ўкрыць на суткі рамамі і матамі. Ад вільгаці павучкі гінуць. Калі ад аднаго разу частка павучкоў яшчэ застаецца ў жывых, трэба праз два дні апырскваньне паўтарыць.

Аграном Калер.



Выбарка рассады капусты з парнікоў прыгараднай гаспадаркі „Новы сьвет".

697

ДЗІЦЯЧАЯ СТАРОНКА

Пра першае МАЯ

(УРЫВАК)

З. Б.

З першым маем
Грае сонца.
З першым маем
Сьвецяць зоры.

Колькі кветак, колькі сонца,
Маем тчэ вясна вузоры.
(Сьпеў) „За радам
рад,
за радам
рад...
Шагай весялей
Першамайскі
атрад".

Гэй шагайма
дружна,
дружна.

Наша моц
і наша дужасьць,
наша сонца,
Нашы зоры,
наша песьня
у прасторы...

Трах-та-ах-тах.
крычыць трамвай
Гу-гу-гу
гудзяць гудкі,
з першым маем,
з першым маем.
Пяюць у полі трактары.
Крочым левай
раз...
два...
тры...
Акцябраты, выхадзі
Стройна, дружна,
рад у рад
за атрадам
ідзе атрад.
Чырвань,
сьцягі...
мора гукаў...
Падняліся ўгору рукі.
Разам
крыкнулі
Урр-а-а!

Ррам, ра...
Урр-а-а,
Уррр-а-а!
Што ёсьць моцы,
крычыць Віцік,
што ёсьць моцы
крычыць Сара
Малы Янка з барабанам
збор хутчэй забарабаніў
(Барабан на збор)
Падраўняўшыся ў пары,
Дзеці там маршыравалі.
Раз, два.
Левай...
Рад у рад
Шагай весялей
першамайскі атрад.

Разам дружна
на ўвесь край
Ян вітаўся
З першым маем.

ЮНЫЯ ПІЯНЭРЫ, ДЗЕЦІ КАСТРЫЧНІКА. БУДЗЬЦЕ ГАТОВЫ ПРАЦЯГВАЦЬ І ЗАВЯРШЫЦЬ ВЯЛІКУЮ СПРАВУ ЛЕНІНА—СПРАВУ СУСЬВЕТНАГА КАСТРЫЧНІКА

ДА ВЕДАМА ЎСІХ ПАДПІШЧЫКАЎ

АДКРЫТА ПАДПІСКА НА ЧАСОПІСЬ

„Работніца і Калгасьніца Беларусі" НА 2-Ю ПАЛОВУ **1933 году**

ЧАСОПІСЬ, ПАЧЫНАЮЧЫ З КРАСАВІКА, ВЫХОДЗІЦЬ ДВА РАЗЫ Ў МЕСЯЦ.

Падпісная цана — 1 год—2 руб. 40 кап. | 3 мес.— 60 кап.
6 мес.—1 „ 20 „ | 1 „ — 20 „

Усім падпішчыкам, якія раней падпісаліся на часопіс, будзе працягнут тэрмін падпіскі, адпаведна ўплачаным грошам і новай падпіснай плаце.

Рэдакцыя часопісі „Работніца і Калгасьніца Беларусі" **Беладдзяленьне Саюздруку**

Выданьне ЦК КП(б)Б **Адк. рэдактар Э. ШАПІРА.**

Друкарня імя Сталіна **Зака́з № 1189** **У ліку 12.000 экз.** **Менгарліт № 1461.**